# Біблія для маленьких



# БІБЛІЯ ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ

## НОВЫ ЗАПАВЕТ



Ілюстрацыі Кэльлі Пульлей

**Минск Юнипак 2013**

УДК 087.5:27-23
ББК 86.37
Б 59

Б 59 **Біблія для маленькіх** / Паводле Beginner's Bible – Минск : Юнипак, 2013. – 240 с.
ISBN 978-985-6802-55-6

**УДК 087.5:27-23**
**ББК 86.37**

**ISBN 978-985-6802-55-6**

© Садоуская Т., тэкст, 2013
© ЗАО «Юнипак», оформление, 2013



## Анёл прыходзіць да Марыі

Бог паслаў анёла Габрыэля да адной дзяўчыны з Назарэту. Яе звалі Марыя. Марыя вельмі напалохалася, таму што ніколі раней ня бачыла анёлаў.



Габрыэль сказаў Марыі: “Ня бойся. Ты народзіш Сына, і дасі Яму імя Ісус. Ён будзе Сынам Божым”.



Марыя занепакоілася: “Ці гэта магчыма?” Анёл адказаў: “Для Бога няма нічога немагчымага”.



Тады Марыя сказала: “Вось я, служка Госпада. Няхай споўніцца воля Бога”.



## Нараджэньне Ісуса

Марыя кахала Язэпа. Яны былі заручаныя і ў хуткім часе зьбіраліся ажаніцца. Язэп жыў у Назарэце, але ягоная сям'я паходзіла з Бэтлеему.




Рымскі імпэратар Аўгуст загадаў жыхарам Юдэі вярнуцца ў свае родныя мясьціны. Ён хацеў пералічыць усіх жыхароў сваёй дзяржавы. Таму  Марыя зь Язэпам выправіліся ў Бэтлеем.



У хуткім часе Марыя павінна была нарадзіць. Калі яны дабраліся да Бэтлеему, то шукалі бясьпечнае месца, у якім можна было пераначыць. Але ўсюды было занята.



Пасьля доўгіх пошукаў Марыя зь Язэпам спыніліся на ноч у хляве аднаго гаспадара.



Язэп падрыхтаваў цёплае месца для Марыі, каб яна адпачыла. У гэтую ноч нарадзіўся Ісус.



Марыя спавіла Ісуса ў пялюшкі і акуратна паклала Дзіцятка ў ясьлі.



## Пастухі прыйшлі да Ісуса

У тую ноч, калі нарадзіўся Ісус, пастухі сьцераглі сваіх авечак. Раптам перад імі зьявіўся анёл, а вакол зазьзяла Божае сьвятло.



Анёл сказаў: “Ня бойцеся! Я прынёс радасную вестку для ўсіх людзей. Сёньня ў горадзе Бэтлееме нарадзілася Дзіцятка – Збаўца Ісус! Вы знойдзеце Яго ў ясьлях!”



Тады зьявіўся хор анёлаў. Яны засьпявалі: “Слава на вышынях Богу! Супакой і мір усім людзям на зямлі!”



Пастухі пасьпяшаліся ў Бэтлеем.
Там яны знайшлі Дзіцятка.
Пастухі расказалі Марыі і Язэпу
тое, што пачулі ад анёла.



Калі пастухі вярталіся да сваіх авечак, то распавядалі ўсім, што бачылі і чулі. Усю дарогу яны гучна славілі Бога.



## Сымон і Ганна сустракаюць маленькага Ісуса

Марыя і Язэп прынесьлі Ісуса ў сьвятыню ў Ерузалім. Там яны сустрэлі пабожнага чалавека, якога звалі Сымон.



Сымон узяў на рукі Ісуса і праславіў Бога. Ён ведаў, што гэтае Дзіцятка – Збаўца ўсіх людзей. Потым Сымон дабраславіў Ісуса, Марыю і Язэпа.



Пры сьвятыні жыла прарочыца Ганна. Яна кожны дзень шмат малілася.



Калі Ганна ўбачыла маленькага Ісуса, яна падзякавала Богу. Усім у сьвятыні яна казала: “Гэта – Сын Божы, Збаўца сьвету!”



## Незвычайная зорка
## і тры мудрацы

Калі нарадзіўся Ісус, у небе зьявілася незвычайная зорка. Мудрацы з Усходу ўбачылі яе.



Яны ведалі, што гэта знак ад Бога
пра нараджэньне вялікага Валадара.
Мудрацы пайшлі за зоркаю. Па
дарозе яны затрымаліся ў Ерузаліме,
каб сустрэцца з валадаром
Ірадам. Яны запыталіся Ірада пра
нованароджанага Валадара.



Ірад быў вельмі злы і зайздросны. Ён паспрабаваў падмануць мудрацоў. “Знайдзіце гэтага Валадара, каб і я мог адсьвяткаваць Ягонае нараджэньне”, – сказаў Ірад.



Зорка прывяла мудрацоў у Бэтлеем. Там яны знайшлі маленькага Ісуса. Мудрацы пакланіліся Ісусу і прынесьлі яму як сапраўднаму Валадару свае дары: золата, кадзіла і міру.



У сьне мудрацам зьявіўся анёл. Ён папярэдзіў іх: “Не вяртайцеся да Ірада”. Таму мудрацы выправіліся назад іншай дарогай.



## Злосны Ірад

Калі тры мудрацы не вярнуліся, валадар Ірад моцна раззлаваўся.



Ён крычаў на сваіх жаўнераў: “Ідзіце і знайдзіце мне гэтае Дзіцятка! Толькі я – адзіны валадар Юдэйскі!”



Божы анёл папярэдзіў Язэпа ў сьне: “Зьбірай сваю сям’ю і ўцякай у Эгіпет. І не вяртайся адтуль, пакуль я не скажу табе, што небясьпека мінула”.



У тую самую ноч Язэп і Марыя
выправіліся зь Ісусам у Эгіпет.



Праз некалькі гадоў анёл Божы зьявіўся Язэпу ў сьне: “Ірад ужо памёр. Таму вы можаце пакінуць Эгіпет”. Так Язэп, Марыя і Ісус вярнуліся ў свой дом у Назарэце.



## Ісус згубіўся

Ісус рос у Назарэце. Штогод на Пасху Ягоная сям'я хадзіла ў Ерузалім, каб там адсьвяткаваць урачыстасьць.



Калі Ісусу было дванаццаць гадоў, то, як звычайна, Ён выправіўся зь сям’ёй у Ерузалім. На вуліцах было вельмі шмат людзей.



Пасьля сьвяткаваньня ўсе зьбіраліся вяртацца дадому, але Язэп і Марыя не маглі знайсьці Ісуса. Яны пыталіся сваякоў і сяброў: “Ці вы ня бачылі Ісуса?” Аднак ніхто ня ведаў, дзе Ён.



Марыя і Язэп моцна ўстрывожыліся і шукалі Ісуса па ўсім горадзе. І вось праз тры дні яны знайшлі Яго!



Ён размаўляў з настаўнікамі
ў сьвятыні. Настаўнікі вельмі
дзівіліся мудрасьці Ісуса.



Марыя і Язэп абнялі Ісуса: "Мы так моцна хваляваліся за Цябе!" – сказала Марыя.



Ісус ведаў, што Бог – Ягоны Тата. Ён адказаў: “Я павінен быў пайсьці ў дом Майго Айца”. Ісус любіў Сваю сям’ю і быў паслухмяным. Ён вярнуўся зь імі дадому. З кожным днём Ён станавіўся больш моцным і разумным.



## Ян хрысьціць Ісуса

Ян нарадзіўся трошкі раней за Ісуса. Ісус і Ян былі стрыечнымі братамі. Калі Ян вырас, то пасяліўся ў пустыні, дзе еў шаранчу і мёд.



Ян расказваў людзям пра Бога. Яму задавалі шмат пытаньняў пра дабро і зло. Ян заклікаў людзей быць добрымі, выхаванымі і сумленнымі.



Ян навучаў людзей пра Божае прабачэньне. Шмат людзей вырашыла зьмяніць сваё жыцьцё і ісьці за Богам. Ян хрысьціў іх у рацэ.



Ян заклікаў людзей пазбавіцца грахоў, каб падрыхтавацца да прыйсьця Збаўцы. Аднойчы да рэчкі прыйшоў Ісус. Ян ведаў, што нарэшце прыйшоў Збаўца, Якога так доўга ўсе чакалі. Ісус сказаў: “Я хачу, каб ты Мяне ахрысьціў”. Ян разгубіўся, але Ісус супакоіў яго: “Будзе правільна, калі ты гэта зробіш”.



Ян завёў Ісуса ў раку і ахрысьціў Яго. На Ісуса зышоў Дух Сьвяты ў выглядзе голуба. У гэты момант Бог сказаў пра Ісуса: “Гэта – Сын Мой улюбёны, Якога Я ўпадабаў Сабе”.



## Ісус выбірае Сваіх вучняў

Ісус пачаў расказваць пра Бога – Свайго Айца. У Ісуса было шмат працы, таму Ён пачаў шукаць памочнікаў.



Калі Ісус хадзіў па беразе возера, Ён пабачыў рыбакоў. Ісус паклікаў іх: “Хадзеце за Мною”.



Рыбакі адразу выйшлі з лодкі
і пайшлі за Ісусам. Гэта былі
Пётар, Андрэй, Якуб і Ян.



Потым Ісус сустрэў мытніка на імя Мацьвей, які зьбіраў падаткі. Мацьвей пакінуў працу мытніка і таксама стаў вучнем Ісуса.




Ісус выбраў іншых вучняў. Гэта былі: Філіп, Баўтрамей, Тамаш і Якуб, сын Алфэя. Да іх далучыліся Тадэвуш, Сымон і Юда.




Цяпер у Ісуса было дванаццаць апосталаў. Ісус распавядаў ім Добрую Вестку пра Божую любоў.



# Першы цуд Ісуса

Ісус са Сваімі вучнямі і маці
Марыяй пайшоў на вясельле.



Марыя пачула, як размаўлялі слугі: “У нас скончылася віно. Што рабіць?” Яна сказала ім: “Зрабіце ўсё, што вам скажа Ісус”.



Ісус сказаў: “Набярыце шэсьць збаноў вады. Потым наліце адтуль вады ў кубак і дайце маршалку”.



Калі яны так зрабілі, то замест вады ўбачылі ў кубку віно. Калі маршалак пакаштаваў віно, сказаў жаніху : “Ты захаваў лепшае віно на канец сьвяткаваньня!” Вучні Ісуса моцна зьдзівіліся. Гэта быў першы цуд Ісуса.



## Ісус вучыць на гары

Шмат людзей прыходзіла, каб пабачыць Ісуса. Дзеці, мамы, таты, бабулі і дзядулі – усе хацелі пачуць, пра што Ён навучае.



“Шчасьлівыя міласэрныя, – сказаў Ісус, бо яны атрымаюць міласэрнасьць.



Шчасьлівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць. Шчасьлівыя міратворцы, бо іх назавуць сынамі Божымі”.



Потым Ісус сказаў: “Вы – сьвятло сьвету. Няхай вашае сьвятло сьвеціць усім людзям, каб яны праслаўілі Айца вашага, Які ў небе”.



# Малітва Госпада

Калі Ісус быў на гары, Ён вучыў людзей, як трэба маліцца. Вось гэтая малітва:

“Ойча наш, Каторы ёсьць у небе, сьвяціся Імя Тваё, прыйдзі Валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі.

Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня і адпусьці нам правіны нашыя, як і мы адпускаем вінаватым нашым.

І ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога. Бо Тваё Валадарства, і моц, і слава навекі. Амэн”.



## Вера сотніка

Калі Ісус зыйшоў з гары, то накіраваўся ў бліжэйшы горад. Вялікі натоўп сабраўся, каб пабачыць Яго.



Адзін сотнік сказаў: “Госпад Ісус, мой слуга моцна захварэў. Дапамажы яму, калі ласка”. Ісус адказаў: “Я пайду ў твой дом і аздараўлю яго”.



Сотнік узрадаваўся: “Ты можаш не ісьці ў мой дом. Скажы толькі слова, і мой слуга будзе здаровы”.



Ісус зьдзівіўся: “Я ніколі ня бачыў людзей з такой моцнай верай”. Потым Ён сказаў сотніку: “Ідзі, твой слуга ўжо здаровы”.  Сотнік пабег дадому. Ён вельмі ўзрадаваўся, калі ўбачыў, што слуга сапраўды здаровы!



## Дзірка ў даху

Ісус навучаў у адным доме. Туды прыйшло мноства людзей, бо яны чулі, што Ісус аздараўляе хворых.



Дом ледзьве зьмяшчаў усіх ахвочых паслухаць Ісуса. Шмат людзей было вымушана стаяць звонку. І нават на двары не хапала ўсім месца.



У той мясцовасьці  жыў чалавек, які ня мог хадзіць. Ён быў спаралізаваны. Ягоныя сябры паверылі, што Ісус можа яго аздаравіць.



Яны паспрабавалі занесьці гэтага чалавека ў дом, дзе навучаў Ісус. Але там быў такі вялікі натоўп! Таму яны паднялі хворага на дах.



Сябры зрабілі ў даху дзірку і празь яе спусьцілі хворага да Ісуса. Ісус убачыў, якая моцная вера была ў гэтых людзей. Ён ведаў, як моцна яны любяць свайго сябра.



Ісус сказаў хвораму:
“Прабачаюцца табе ўсе твае грахі.
Устань і хадзі.” Чалавек, які быў
хворы, устаў і пачаў хадзіць! А ўсе
людзі славілі Бога.



## Ісус суцішвае буру

Ісус і Ягоныя вучні ўвайшлі ў човен. Яны паплылі праз возера.



Ісус заснуў. Хвалі раз-пораз ціхенька пастуквалі па чаўне.



Раптам наляцела вялікая бура. Хвалі залівалі човен. Шалёны вецер зьбіваў вучняў з ног.



Апосталы пабудзілі Ісуса і крычалі: “Ратуй нас, човен зараз патоне!”



Ісус сказаў: “Чаго вы баіцёся? Няўжо няма ў вас веры?” І загадаў буры сьціхнуць. Адразу настала ціша.



Вучні былі моцна ўражаныя. Паміж сабою яны казалі: “Хто ж Ён? Нават вецер і хвалі слухаюцца Яго!”



## Два цуды

Аднойчы чалавек на імя Яір прыйшоў да Ісуса. Ён моцна прасіў: “Ісус! Калі ласка, прыйдзі ў мой дом і аздаравi маю дачку. Яна памірае”.



“Калі Ты толькі дакранешся да маёй дачкі, яна станецца здаровай”, – сказаў Яір. Ісус з вучнямі пайшлі ў дом Яіра.



Вялікі натоўп ішоў за Ісусам, калі Той накіраваўся ў дом няшчаснага бацькі.



У гэты час да Ісуса праз натоўп прабіралася жанчына. Яна хварэла ўжо дванаццаць гадоў. Лекары не маглі вылечыць яе.



Жанчына верыла, што Ісус можа яе аздаравіць. Яна думала: “Калі толькі я дакрануся да Ягонай вопраткі, стануся здаровая”.



Калі жанчына наблізілася да Ісуса, то працягнула руку і дакранулася да Яго. І адразу ж аздаравілася! А Ісус спыніўся і спытаў: “Хто дакрануўся да Мяне?”



Жанчына стала на калені перад Ісусам і сказала: “Гэта я дакранулася да Цябе”. “Твая вера аздаравіла цябе. Ідзі ў супакоі”, – сказаў ёй Сын Божы.



Нарэшце Ісус прыйшоў у дом Яіра. Але людзі казалі, што ўжо позна. Дзяўчынка памерла.



Ісус сказаў: “Яір, павер Мне. Твая дачка не памерла. Яна сьпіць”.



Ісус папрасіў усіх выйсьці з дому. Зь Яірам і ягонай жонкай яны пайшлі ў пакой дзяўчынкі. Ісус схіліўся каля яе і сказаў: “Прачніся, Маё дзіцятка”.



Пасьля гэтых словаў дзяўчынка расплюшчыла вочы і ўстала з ложку. Бацьку і маці дзяўчынкі ахапіла вялікая радасьць.



# Рыбацкі нерат

Ісус расказаў такую гісторыю: “Аднойчы рыбакі паплылі ў сваім чаўне лавіць рыбу.



У возеры плавала разнастайная рыба. Рыбакі закінулі ў ваду нерат.



Пасьля яны вярнуліся на бераг, дасталі нерат і перагледзелі, што ім трапілася.



Усе добрыя рыбы яны пакінулі сабе, а благія выкінулі вон. Рыбацкі нерат падобны да Божага Валадарства.



Кожны хоча туды ўвайсьці, але прыйдуць анёлы і аддзеляць добрых людзей ад кепскіх.



Добрыя і справядлівыя людзі будуць вечна жыць са Мною ў Нябёсах”.



## Ісус корміць тысячы людзей

Ісус і Ягоныя вучні стаміліся. Ім патрэбна было ціхае месца для адпачынку. Яны селі ў човен і адплылі ад берагу. Уздоўж берагу за чаўном ішоў натоўп.



Больш за пяць тысячаў чалавек прыйшлі паглядзець на Сына Божага. Ісус хацеў  дапамагчы ім, хоць і быў стомлены. Ён выйшаў з чаўна і пачаў дабраслаўляць і аздараўляць людзей.



Напрыканцы дня вучні сказалі Ісусу: “Ужо позна, гэтыя людзі павінны ісьці дадому, каб павячэраць”.



Ісус адказаў: “Вы накарміце іх. Паглядзіце, ці ёсьць тут нейкая ежа”.



У аднаго хлопчыка было пяць хлябоў і дзьве маленькія рыбкі. Ісус сказаў: “Прывядзіце хлопчыка да Мяне”.



Вучні запыталіся: “Як столькі людзей могуць наесьціся такой маленькай колькасьцю ежы?” Ісус сказаў: “Пабачыце. Скажыце людзям, каб яны селі”. Тады Ісус узяў хлеб і падзякаваў Богу.



Ягоныя вучні раздавалі ўсім хлеб і рыбу. Апосталы былі зьдзіўленыя, калі ўбачылі, што засталося яшчэ дванаццаць кашоў ежы!



## Ісус ходзіць па вадзе

Ісус паслаў апосталаў, каб яны плылі на іншы бераг перш, чым туды Сам дабярэцца.



Ісус узыйшоў на гару, каб памаліцца. Ён бачыў вучняў у чаўне. Неба зацягвалі хмары. Яшчэ крыху, і на возеры пачнецца бура.



Гудзеў вецер. Хвалі залівалі лодку, кідаючы яе ў розныя бакі.



Раптам вучні ўбачылі, як хтосьці ідзе да іх па вадзе. Яны падумалі, што гэта здань!



Ісус закрычаў ім: “Гэта Я, ня бойцеся!” Вучні ўсё яшчэ не былі ўпэўненыя, што перад імі Ісус. Пётар сказаў: “Калі Ты сапраўды Ісус, то скажы мне падыйсьці да Цябе”. Ісус адказаў: “Ідзі!”



Пётар выйшаў з чаўна і пакрочыў да Ісуса. Раптам Пётар паглядзеў на вецер і на хвалі. Яго агарнуў страх. І Пётар пачаў тануць. “Госпадзе, ратуй мяне!” – крычаў Пётар. Ісус нахіліўся і выцягнуў Пятра з вады.



“Чаму ты забаяўся і не паверыў Мне да канца?” – запытаўся Ісус у Пятра. Яны ўвайшлі ў човен, і навальніца скончылася. Вучні славілі Ісуса. Яны казалі: “Сапраўды, Ты – Сын Божы!”



## Ісус аздараўляе сьляпога

Аднойчы Ісус з апосталамі сустрэлі сьляпога жабрака. Гэты чалавек ня бачыў ад нараджэньня. Вучні спыталіся Ісуса: “Настаўнік, чаму ён сьляпы? Ён зграшыў? Ці зграшылі ягоныя бацькі?”



“Гэта здарылася для таго, – адказаў Ісус, – каб у ягоным жыцьці зьявілася слава Божая”. Ісус плюнуў на зямлю і зрабіў балотка. Потым асьцярожна намазаў яго на павекі сьляпога.



Ісус сказаў жабраку: “Ідзі да сажалкі Сілоам і змый балотка”.



Як толькі балотка было змытае з вачэй, чалавек пачаў бачыць! Усе былі ў захапленьні! Яны хацелі яшчэ больш даведацца пра Ісуса.



## Грошы ў рыбіне

Быў час збору падатку на сьвятыню. Гэтыя грошы былі патрэбныя на рамонт сьвятыні.



Зьбіральнікі падатку прыйшлі да Пятра і спыталіся: “Ці заплаціць Ісус падатак на сьвятыню?” Пётар адказаў: “Вядома, заплаціць”.



Пасьля гэтага Пётар спытаўся Ісуса, што рабіць. Ісус адказаў яму: “Хоць Я Сын – Божы, але дам падатак. Ідзі, злаві рыбу. Зазірні ёй у рот, і там знойдзеш манэту. Вазьмі манэту і аддай зьбіральнікам падатку. Гэтага хопіць і за Мяне, і за цябе”.



Пётар злавіў рыбу, адкрыў ёй рот і знайшоў там манэту! Гэтага акурат хапіла, каб заплаціць падатак.



## Добры самаранін

Адзін чалавек, які добра ведаў Сьвятое Пісаньне, вырашыў выспрабаваць Ісуса. Ён сказаў: “Я ведаю, што Закон абавязвае ўсім сэрцам любіць Бога і любіць бліжняга, як самога сябе. А хто мой бліжні?”



Ісус распавёў яму такую прыповесьць: “Адзін чалавек ішоў у горад Ерыхон. Па дарозе на яго напалі злодзеі. Яны забралі ў яго ўсё, што ён меў. А гэты чалавек быў паранены. Яму патрэбная была дапамога.



Празь нейкі час па дарозе ішоў сьвятар. Ён заўважыў параненага вандроўніка, але нават не спыніўся. Праходзіў паблізу таксама лявіт. Ён убачыў параненага, але не дапамог.



Потым ішоў той дарогай самаранін. Ён спыніўся, падняў параненага, пасадзіў на свайго асла і завёз у гатэль. Самаранін даглядаў параненага ўсю ноч.



Раніцаю самаранін даў гаспадару гатэля дзьве срэбныя манэты і сказаў: “Даглядай за ім, пакуль я не вярнуся”.



Калі Ісус скончыў расповед, то запытаўся: “Хто ж з гэтых трох людзей быў бліжнім параненаму?” Чалавек, які задаў пытаньне, адказаў: “Той, хто дапамог параненаму”. Ісус сказаў: “Ідзі і рабі так, як ён”.



## Марыя і Марта

Марыя, Марта і іхні брат Лазар сябравалі зь Ісусам.



Аднойчы Ісус прыйшоў да іх у госьці. Марыя доўгі час сядзела каля Ісуса і слухала Яго.



А Марта ў гэты час гатавала ежу. Ёй трэба было столькі ўсяго зрабіць!



Чым больш Марыя слухала Ісуса, тым больш Марта злавалася. Яна сказала: “Я працую на кухні, а Марыя нічога ня робіць!”



“Ісус, прашу Цябе, скажы Марыі, каб яна дапамагла мне”, – паскардзілася Марта.



“Марта, Марта, – сказаў Ісус, – ты не павінна злавацца. Марыя выбрала тое, што больш важнае. Яна слухае Маё Слова”.



## Згубленая авечка

Некаторыя людзі разважалі, хто галоўны ў вачах Бога. Тады Ісус расказаў ім прыповесьць:



“Паглядзіце на пастуха. Што ён робіць? Пастух даглядае свае авечкі. Ён дае ім шмат ежы і шмат вады.



Пастух лічыць свае авечкі, каб быць упэўненым, што ўсе авечкі на месцы. Калі адна авечка згубіцца, ён ідзе шукаць яе. Пастух шукае яе ў хляве, каля крынічкі, у гарах – паўсюль.



Пастух не здаецца і не адступае. Урэшце ён знаходзіць згубленую авечку!



Бярэ яе на плечы і нясе ў свой статак. Потым ён зьбірае сяброў і кажа: “Давайце радавацца! Я знайшоў маю згубленую авечку!”



Потым Ісус сказаў: “Бог любіць кожнага са Сваіх дзяцей так, як пастух любіць свае авечкі. Калі Божае дзіця грашыць, то яно як згубленая авечка. Бог з-за яго моцна сумуе. Аднак, калі гэты чалавек адварочваецца ад граху і зноў робіць добрае, Бог вельмі моцна радуецца. Ён шчасьлівы як пастух, які знайшоў сваю згубленую авечку”.



## Марнатраўны сын

Ісус расказаў яшчэ адну гісторыю пра Божую любоў: “Жыў адзін чалавек, і былі ў яго два сыны. У гэтага чалавека была вялікая гаспадарка.



Малодшы сын не захацеў працаваць, але захацеў вандраваць і весяліцца. Ён папрасіў свайго тату аддаць ягоную частку маёмасьці.



Сын атрымаў грошы, сабраў свае рэчы і пайшоў з дому. Ён ня мог дачакацца, калі пабачыць сьвет! Сям'я са смуткам глядзела, як сын зыходзіць.



Напачатку яму падабалася мець шмат грошаў. Ён купляў сабе дарагую вопратку і еў вельмі смачную ежу. Аднак хутка ён выдаткаваў усё, што атрымаў ад бацькі ў спадчыну.



Малады чалавек быў вымушаны шукаць, што паесьці, і пайшоў працаваць на фэрму, дзе гадавалі сьвіней. Ён быў такі галодны, што нават ежа для сьвіней падавалася яму смачнай.  І тады ён вырашыў вярнуцца дадому. Ён падумаў: “Я скажу тату, што каюся ў тым, што зрабіў. Я не заслугоўваю звацца ягоным сынам. Можа, ён прыме мяне хаця б як свайго працаўніка”.



Бацька ўбачыў, што ягоны сын вяртаецца. Бацькавы вочы напоўніліся сьлязьмі, і ён хуценька пабег насустрач свайму сыну.



Сын сказаў: “Тата, прабач мяне, калі ласка!” У той жа дзень бацька зладзіў вялікае сьвята. Ён радаваўся ад усяго сэрца і ўсім казаў: “Мой сын згубіўся, але ізноў знайшоўся!”



Ісус патлумачыў Сваю прыповесьць: “Бог падобны на гэтага бацьку. Ён зь любоўю і радасьцю прыймае ўсіх згубленых, што навяртаюцца да Яго”.



## Дзесяць пракажоных

Падчас Сваёй вандроўкі Ісус сустрэў дзесяць пракажоных. Іхнія целы былі ўсе ў больках. Пракажоныя крычалі: “Ісус, аздаравi нас, калі ласка!”



Ісус сказаў: “Ідзіце і пакажыцеся сьвятарам”. Пракажоныя пайшлі да сьвятароў. І здарылася штосьці неверагоднае.



Усе дзесяцёра пракажоных аздаравіліся ад сваёй хваробы! Аднак толькі адзін зь іх вярнуўся, каб падзякаваць Ісусу за аздараўленьне.



Ён кінуўся да ног Ісуса і сказаў: “Дзякую Табе!” Ісус спытаўся: “А дзе ж астатнія?” Але тыя не прыйшлі да Ісуса падзякаваць.



# Ісус і дзеці

Дзеці любілі быць зь Ісусам.



Але апосталы не разумелі гэтага. Яны казалі дзецям: “Не турбуйце Ісуса! Ён і так вельмі заняты!”



Ісус сказаў вучням: “Дазвольце дзецям прыходзіць да Мяне. Не трымайце іх далёка ад Мяне. Вы павінны стаць як маленькія дзеці, калі хочаце ўвайсьці ў Валадарства Божае”.



Потым Ісус дабраславіў дзяцей.



## Маленькі чалавек

Вялікі натоўп на вуліцы чакаў Ісуса. Сярод натоўпу быў таксама  Закхей, які ніяк ня мог убачыць Ісуса, бо быў невысокага росту. Тады Закхей вырашыў узьлезьці на дрэва.



Калі Ісус праходзіў ля таго месца, Ён паглядзеў уверх і закрычаў: “Закхей, злазь з дрэва! Я хачу прыйсьці ў твой дом!” Шчасьлівы Закхей хуценька спусьціўся ўніз.



Закхей быў зборшчыкам мыта. Ён зьбіраў падаткі  і аддаваў іх валадару. Таму людзі не любілі Закхея. З гэтай прычыны Закхей вельмі зьдзівіўся, калі пачуў, што Ісус хоча прыйсьці ў ягоны дом.



Натоўп стаяў каля дома. Людзі перашэптваліся: “Навошта Ісус туды пайшоў?”



Закхей сказаў Ісусу: “Я аддам грошы бедным і вярну ўсё тым, каго я падмануў. Аддам  нават болей грошай, чым узяў”. Ісус узрадаваўся, што Закхей  вырашыў выправіць свае кепскія ўчынкі.



## Лазар ізноў жывы

Аднойчы Ісус атрымаў вестку ад Марыі і Марты: “Прыходзь хутчэй, Лазар вельмі хворы”.



Аднак Ісус яшчэ два дні заставаўся ў тым горадзе, дзе быў. Потым выправіўся да Марыі і Марты. Марыя выйшла Яму насустрач. Яна плакала.



Марыя сказала Ісусу: “Мой любімы брат памёр. Калі б Ты быў тут раней, то мог бы аздаравіць яго”. Ісус засмуціўся і таксама заплакаў.



Потым Ён пайшоў да магілы, дзе быў пахаваны Лазар. Ісус папрасіў людзей адсунуць камень з магілы і гучна памаліўся: “Ойча, Я ведаю, што Ты заўсёды Мяне слухаеш. Пакажы ўсім, што гэта Ты Мяне паслаў”.



Потым Ісус усклікнуў: “Лазар, выходзь!” Лазар выйшаў з магілы. Ён ізноў быў жывы! Усе былі вельмі моцна зьдзіўленыя. У той дзень шмат людзей паверыла ў Ісуса.



## Дар для Ісуса

Аднойчы ўвечары Ісус з вучнямі прыйшоў у госьці да Марыі, Марты і Лазара.



Марыя выліла на ногі Ісуса каштоўны духмяны алей. Потым яна выцерла Ягоныя ногі сваімі валасамі.



Адзін з апосталаў, якога звалі Юда, сказаў: “Гэты алей вельмі шмат каштуе. Лепш бы Марыя прадала яго і раздала грошы бедным”.



Але Ісус ведаў праўду: Юда хацеў сам атрымаць тыя грошы. Ён адказаў: “Марыя зрабіла слушна. Яна аддала Мне хвалу. Бедныя заўсёды будуць сярод вас. А Я не заўсёды буду побач з вамі”.



## Сапраўдны Валадар

Ісус і апосталы выправіліся ў Ерузалім на сьвята Пасхі. Ісус папрасіў двух вучняў, каб прывялі Яму восьліка.



На восьліку Сын Божы
прыехаў у Ерузалім.



Ісуса сустракаў вялікі натоўп жыхароў Ерузаліму.



Людзі віталі Ісуса пальмавымі галінкамі і клалі іх на дарогу перад Ісусам.



Яны крычалі: “Гасанна! Гасанна! Дабраславёны Валадар Ізраэля!”



Начальнікам у Ерузаліме не падабаўся Ісус. Яны бачылі, як шмат людзей ідзе за Ім. Гэта злавала іх. Яны моцна зайздросьцілі.



## Ахвяра беднай удавы

Ісус з вучнямі прыйшоў у сьвятыню. Яны глядзелі, як людзі кладуць грошы ў скрынку для ахвяраваньняў.



Багатыя клалі туды шмат грошай.



Потым Ісус убачыў бедную ўдаву. Яна кінула ў скрынку дзьве маленькія манэткі. “Дар гэтай жанчыны большы за ўсе астатнія”, – сказаў Ісус апосталам.



“Нягледзячы на тое, што яна дала няшмат, яна аддала ўсе грошы, якія мела. Багатыя людзі давалі шмат грошай, але толькі таму, што мелі іх нашмат больш”, –  сказаў Ісус.



## Ісус мые ногі вучням

Ісус з вучнямі сабраліся на Пасхальную вячэру. Сын Божы ведаў, што ўжо хутка пакіне іх.



Пасьля вячэры Ісус зьняў вопратку і падперазаўся ручніком. Затым Ён наліў у  міску вады. Ісус мыў і выціраў ногі ўсім Сваім вучням па чарзе.



Надыйшла чарга Пятра. Ён засаромеўся: “Госпадзе, Ты не павінен мыць мае ногі”. Ісус адказаў: “Я павінен памыць твае ногі, каб ты мог уавайсьці ў Маё Валадарства”.  Потым Ісус сказаў вучням: “Так, як Я памыў вашыя ногі, вы павінны мыць ногі адзін аднаму”. Ісус зрабіў так, каб паказаць, што трэба служыць адзін аднаму.



Ісус сказаў ім: “Адзін з вас здрадзіць Мяне ў гэтую ноч”. Апосталы былі ўражаныя і казалі: “Я ніколі так не зраблю!”



“Хто здрадзіць Цябе?” – запытаўся Ян. “Той, каму Я дам гэты кавалак хлеба”, – сказаў Ісус. Ён даў хлеб Юду.



## Вячэра Госпадава

Потым Ісус  узяў хлеб і дабраславіў яго. Ён паламаў хлеб на кавалкі і падзяліў паміж вучнямі.



Ісус сказаў: “Гэты хлеб – Маё Цела. Кожны раз, калі будзеце ламаць хлеб, узгадвайце пра Мяне”. Гэтаксама Ісус узяў кубак віна і дабраславіў яго.



Потым даў вучням кубак і сказаў: “Гэта Кроў Мая. Яна пралітая дзеля таго, каб былі прабачаныя грахі многіх.  Прыйшоў час, калі Я павінен зыйсьці. Туды, куды Я іду, вы яшчэ ня можаце пайсьці. Я іду ў неба, каб падрыхтаваць цудоўны новы дом для вас. Але Я яшчэ вярнуся.



Спачатку вы будзеце моцна сумаваць. Але ня бойцеся. Хутка вы ўсё зразумееце, і вас напоўніць радасьць".



## Ісуса арыштавалі і ўкрыжавалі

Юда пайшоў да начальнікаў. Ён запытаўся: “Колькі вы заплаціце мне, калі я дапамагу вам схапіць Ісуса?” Яны адказалі: “Трыццаць срэбных манэт”. Юда ўзяў грошы і падрыхтаваў плян.



Ісус пайшоў у свой любімы сад, каб памаліцца. За Ім ішлі вучні. Божы Сын маліўся: “Ойча, калі ёсьць на гэта Твая воля, то Я гатовы аддаць Маё жыцьцё, каб усе, хто верaць у Мяне, былі ачышчаныя ад грахоў”.



Неўзабаве ў сад прыйшоў Юда з жаўнерамі. Пётар хацеў абараніць Ісуса. Аднак Ісус сказаў: “Ня трэба. Гэта павінна здарыцца”. Усе вучні разьбегліся, і жаўнеры арыштавалі Ісуса.



Яны прывялі Ісуса да начальнікаў. Тыя сказалі: “Ты сьцьвярджаеш, што Ты – Сын Божы. Мы ня верым Табе!”



Начальнікі аддалі Ісуса жаўнерам. Тыя загадалі Ісусу несьці вялікі драўляны крыж. Жаўнеры прывялі Ісуса на месца, якое звалася Гальгота. Там яны прыбілі Ісуса да крыжа.



Божы Сын памёр на крыжы.



Усе, хто любілі Ісуса, вельмі сумавалі. Аднак яны забыліся пра штосьці вельмі важнае. Ісус абяцаў, што хутка вернецца, і яны ізноў убачаць Яго!



# Ісус уваскрос

Пасьля сьмерці Ісуса сябры паклалі Ягонае цела ў магілу. Уваход туды быў закрыты вялікім каменем. Магілу ахоўвалі жаўнеры.



Праз тры дні пасьля сьмерці Ісуса здарыўся землятрус. Божы анёл зыйшоў зь неба і адсунуў камень ад магілы. Калі жаўнеры ўбачылі анёла, яны паваліліся на зямлю.



Да магілы Ісуса прыйшла Марыя разам зь іншымі жанчынамі. Іх сустрэў анёл і сказаў: “Ня бойцеся! Ісуса тут няма. Ён уваскрос!



Ідзіце і скажыце Пятру ды іншым вучням, што Ісус жывы!" Па дарозе жанчыны сустрэлі Ісуса. Яны схіліліся на калені і пакланіліся Яму. Ісус сказаў: "Ідзіце і скажыце іншым, што мы сустрэнемся ў Галілеі".



## Ісус прыйшоў да вучняў

Вучні зачыніліся ў маленькай хатцы. Яны баяліся, што іх таксама арыштуюць.



Раптам зьявіўся Ісус! Ён сказаў: “Супакой вам!” Вучні падумалі, што гэта дух. Але Ісус сказаў: “Дакранецеся да Маіх рук і Маіх ног і вы зразумееце, што гэта сапраўды Я”.



Вучні крычалі ад радасьці! Яны былі вельмі, вельмі шчасьлівыя, што ізноў бачаць Ісуса.



## Поўны нерат

Пётар пайшоў лавіць рыбу разам зь некалькімі сябрамі. Яны працавалі цэлую ноч, але не злавілі ніводнай рыбкі.



На сьвітаньні хтосьці на беразе закрычаў ім: “Ці вы злавілі штонебудзь?” Яны адказалі: “Нічога не злавілі”. “Закіньце нерат справа ад чаўна”, – сказаў чалавек на беразе.



Як толькі вучні зрабілі гэта, іхні нерат напоўніўся рыбаю! Пётар адразу зразумеў, што чалавек на беразе – гэта Ісус. Ён выскачыў з чаўна і паплыў да любімага Настаўніка.



Ісус запытаўся ў яго: “Ці любіш ты Мяне?” Пётар адказаў: “Так, Ты ж ведаеш”. Ісус сказаў: “Калі ты любіш Мяне, то клапаціся пра Мой народ”.



## Ісус ідзе ў неба

Ісус сказаў Сваім вучням: “Я аддаў Сваё жыцьцё, каб вы маглі быць са Мною ў небе. Я іду туды, каб падрыхтаваць вам месца. Калі Я прыйду наступны раз, то забяру вас з Сабою”.



Ісус сказаў Сваім вучням: “Бог даў
Мне ўсю ўладу ў небе і на зямлі.
Ідзіце і раскажыце ўсім Добрую
Вестку. Знайдзіце новых вучняў.
Ахрысьціце іх і навучыце выконваць
Мае прыказаньні.



Ніколі не забывайцеся, што Я заўсёды буду з вамі. Ідзіце ў Ерузалім і чакайце. Дух Сьвяты зыйдзе на вас. Ён дасьць вам уладу казаць людзям пра Мяне. Вось, прыйшоў час Мне ісьці ў неба. Ня бойцеся".



Раптам зьявіліся аблокі, і Ісус падняўся ў неба. Ягоныя вучні доўга глядзелі Яму ўвасьлед.



Пасьля вучні ўзгадалі, што казаў ім Ісус. Яны вярнуліся ў Ерузалім і чакалі спасланьня Сьвятога Духа.



## Спасланьне Сьвятога Духа

Тысячы людзей прыйшлі ў Ерузалім на сьвята Пяцідзясятніцы. Яны прыходзілі з розных краінаў і размаўлялі на розных мовах. Былі тут і вучні Ісуса. Яны ўсе разам маліліся.



Раптам усё напоўнілася нейкім шумам, падобным да моцнага ветру. Дух Сьвяты зьявіўся ў выглядзе языкоў полымя над кожным з вучняў



Апосталы пачалі размаўляць на розных мовах, якіх ня ведалі раней. У Ерузаліме быў чуцен гэты шум, і людзі прыйшлі паглядзець, што адбываецца.



Людзі дзівіліся: “Як вы можаце размаўляць на розных мовах?” Пётар адказаў: “Прарокі абвяшчалі, што так станецца”.



Пётар расказаў людзям пра Божае збаўленьне: “Бог паслаў Ісуса, каб збавіць усіх людзей”.



Людзі пыталіся: “А што нам рабіць?” Пётар адказаў: “Прасіце Ісуса пра прабачэньне грахоў і ахрысьціцеся ў Ягонае імя”.



У той дзень тры тысячы чалавек паверылі ў Ісуса. Вучні хрысьцілі іх усіх.



## Першая Царква

Тыя, хто паверыў у Ісуса, слухалі навуку апосталаў і шмат даведаліся пра Бога і Ягоную любоў.



Усе разам яны маліліся,



сьпявалі і славілі Бога.



Яны разам елі і ўдзельнічалі ў Вячэры Госпадавай. Яны дзяліліся зь іншымі ўсім, што мелі. Кожны дзень Бог далучаў да Царквы новых людзей.



## Аздараўленьне кульгавага

Аднойчы Пётар і Ян ішлі ў сьвятыню. Яны ўбачылі жабрака, які ня мог хадзіць. Ён быў хворы ад нараджэньня.



Пётар сказаў яму: “У нас няма ані срэбра, ані золата. Мы дамо табе тое, што маем. У імя Ісуса ўстань і хадзі!”



Чалавек адразу ж устаў на ногі! Ён пачаў хадзіць, падскокваць і славіць Бога.



Усе, хто бачылі, зьдзівіліся. Пётар сказаў ім: “Ня мы аздаравілі гэтага чалавека. Гэта зрабіў Ісус”.  У гэты дзень шмат людзей паверыла ў Ісуса.



## Пераменены чалавек

Саўл ненавідзеў вучняў Ісуса.
Ён выправіўся ў дарогу, каб
арыштаваць іх і кінуць у вязьніцу.



Раптам вакол яго зьявілася яркае сьвятло. Саўл паваліўся на зямлю. Ён пачуў голас: “Саўл, чаму ты ідзеш супраць Мяне?” Саўл напалохаўся. Ён закрычаў: “Хто Ты?” Голас адказаў: “Я – Ісус, Якога ты перасьледуеш”.



“Ідзі ў Дамаск, там ты даведаешся, што павінен рабіць”, –  сказаў Ісус. Калі Саўл  падняўся на ногі, ён нічога ня бачыў.



Людзі дапамаглі яму дабрацца да гораду. У гэты час Ісус зьявіўся таксама чалавеку, якога звалі Ананія, і папярэдзіў яго пра прыход Саўла.



Ананія ўсклаў свае рукі на галаву Саўла і сказаў: “Ісус паслаў мяне да цябе. Ты ізноў зможаш бачыць. Прымі Духа Сьвятога”. І да таго, хто перасьледаваў вучняў Ісуса, ізноў вярнуўся зрок! Ананія ахрысьціў Саўла.



Саўл зьмяніў сваё імя і стаў звацца Паўлам. Ён стаў новым чалавекам! Цяпер ён любіў вучняў Ісуса і больш не перасьледаваў іх. Павал сам стаў верным вучнем Ісуса.



## Падарожжы Паўла

Павал шмат вандраваў. Кожнаму, каго ён сустракаў, ён расказваў пра Ісуса. Новыя вучні сталі называцца хрысьціянамі, бо яны верылі, што Ісус – гэта Хрыстос, значыць, Збаўца і Госпад.



Павал вандраваў з рознымі памочнікамі. Ён абвяшчаў Добрую Вестку, і шмат людзей паверылі ў Ісуса.



Падчас сваіх вандровак Павал заснаваў шмат цэркваў. За гэты час Павал прайшоў шмат кіламетраў,



шмат пераплыў на караблі праз моры. Паўсюль Павал казаў пра Божую любоў да кожнага чалавека.



## Як адчынілася вязьніца

Некаторым людзям не падабалася, што Павал і ягоны сябар Сіла расказвалі пра Ісуса. Аднойчы іх абодвух схапілі і пасадзілі ў вязьніцу. Аднак Павал і Сіла не баяліся, бо ведалі, што Бог паклапоціцца пра іх. Яны сьпявалі і славілі Бога.



У тую ноч Бог зрабіў землятрус. Вязьніца затрэслася так, што ўсе дзьверы ў ёй паадчыняліся, і з усіх вязьняў зваліліся ланцугі. Ахоўнік напалохаўся. Ён падумаў, што ўсе вязьні зьбеглі.



Павал сказаў гэтаму чалавеку: “Не хвалюйся, мы ўсе тут”. Ахоўнік быў уражаны і запрасіў Паўла і Сілу ў свой дом.



Ён і ягоная сям'я даведаліся пра Ісуса і сталі хрысьціянамі. На наступны дзень Павал і Сіла выправіліся ў дарогу, каб распавядаць іншым людзям пра Ісуса.



## Ісус прыйдзе зноў

Прайшло шмат гадоў пасьля сьмерці і ўваскрасеньня Ісуса. Апостал Ян быў арыштаваны і жыў на высьпе. Там Ісус паказаў Яну тое, што чакае ўсіх людзей у будучыні.



Апостал Ян ўбачыў Ісуса, Якога з усіх бакоў атачала яркае сьвятло. Сын Божы сказаў Яну: “Ня бойся. Напішы кнігу пра тое, што ты зараз бачыш, і разашлі гэтую кнігу па ўсіх цэрквах”.



Потым Ян убачыў Бога, Які сядзеў на пасадзе. Вакол зьзяла вясёлка. Ян зразумеў, што надыйдзе канец усякага зла на зямлі.



Ян пабачыў таксама новае неба і новую зямлю. Ісус сказаў: “Калі прыйду зноў, больш ня будзе сьмерці і смутку, плачу і болю. Я назаўсёды застануся з Маім народам”.



Ісус паабяцаў: “Я хутка вярнуся!”

# ЗЬМЕСТ


Анёл прыходзіць да Марыі ... 3
Нараджэньне Ісуса ... 7
Пастухі прыйшлі да Ісуса ... 13
Сымон і Ганна сустракаюць маленькага Ісуса ... 18
Незвычайная зорка і тры мудрацы ... 22
Злосны Ірад ... 27
Ісус згубіўся ... 32
Ян хрысьціць Ісуса ... 39
Ісус выбірае Сваіх вучняў ... 44
Першы цуд Ісуса ... 50
Ісус вучыць на гары ... 54
Малітва Госпада ... 59
Вера сотніка ... 60
Дзірка ў даху ... 64
Ісус суцішвае буру ... 70
Два цуды ... 76
Рыбацкі нерат ... 87
Ісус корміць тысячы людзей ... 93
Ісус ходзіць па вадзе ... 100
Ісус аздараўляе сьляпога ... 107
Грошы ў рыбіне ... 111
Добры самаранін ... 115
Марыя і Марта ... 121
Згубленая авечка ... 127
Марнатраўны сын ... 133
Дзесяць пракажоных ... 141
Ісус і дзеці ... 145
Маленькі чалавек ... 149
Лазар ізноў жывы ... 154
Дар для Ісуса ... 159

Сапраўдны Валадар 163
Ахвяра беднай удавы 169
Ісус мые ногі вучням 173
Вячэра Госпадава 178
Ісуса арыштавалі і ўкрыжавалі 182
Ісус уваскрос 189
Ісус прыйшоў да вучняў 193
Поўны нерат 196
Ісус ідзе ў неба 200
Спасланьне Сьвятога Духа 205
Першая Царква 212
Аздараўленьне кульгавага 216
Пераменены чалавек 220
Падарожжы Паўла 226
Як адчынілася вязьніца 230
Ісус прыйдзе зноў 234

ISBN 978-985-6802-55-6

Рэдактар: Антоні Бокун

Карэктар: Д.Шэніна, Н. Шэніна

Макет: Т. Садоўская

Адказны за выпуск: Н. Бачышча

Падпісана да друку 14.03.2013. Фармат 60x90/16. Наклад 1000. Заказ № 0629.

Выдавец ЗАТ “Юніпак”
ЛИ №02330/0150278 ад 03.05.2008 г.
Вул. Старажоўская, 8, п.скр. 69, Мінск, 220002, Беларусь
Тэл./факс: (375 17) 281 46 98

Друкарня “Палікракфт”
ЛИ №02330/0494199 ад 03.04.2009 г.
Вул. Кнорына, 50, корп. 4, п. 401а, г. Мінск, 220103, Беларусь



НОВЫ ЗАПАВЕТ

БІБЛІЯ ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ • НОВЫ ЗАПАВЕТ